ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

3 лістапада 1931 г.
№ 258 (1525)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

Хутчэй перабудавацца

У выніку бурных тэмпаў разьвіцьця нашай прамысловасьці, за апошні год у радох рабочае клясы адбыліся велізарныя зьмены. Прыход у нашу прамысловасьць звыш 2 мільёнаў рабочых, з якіх велізарная колькасьць моладзі, з усёй рашучасьцю высоўвае перад усёй партыяй, профсаюзамі і комсамолам пытаньне рашучай перабудовы метадаў і форм масавай работы.

Навучыць гэты новы наток рабочых любіць соцыялістычную прамысловасьць, паважаць свой варштат, свой інструмэнт, біцца за якасьць работы плюс тэмпы—такава наша задача.

„Мы павінны так паставіць сваю організатарскую работу, каб яна праводзіла ў жыцьцё дырэктывы, якія мы даем“ (Кагановіч).

Правільна расставіць комсамольскія сілы на рашаючых і вузлавых вучастках вытворчасьці, будзь-та прадпрыемства, чыгунка, саўгас ці колгас—адна з рашаючых умоў для яшчэ большага павышэньня ўдзелу комсамольскай організацыі ў соцыялістычным будаўніцтве. Саюз павінен перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі, новымі абставінамі ходу соцыялістычнага будаўніцтва.

У аснову ўсёй нашай работы павінны быць пакладзены шэсьць указаньняў тав. Сталіна. За іх выкананьне мы павінны змагацца.

Трэба ўсьвядоміць, што рашаючым зьяўляецца цяпер уменьне організоўваць работу зьверху да нізу ў галіне практычнага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі і ўраду. Адгэтуль узмацненьне перабудовы нізавога зьвяна саюзу і яго апорных пунктаў: групы, брыгады—адна з ударных задач кожнага комсамольскага колектыву.

Практыка перабудовы раду комсамольскіх камітэтаў і колектываў нашых прамысловых цэнтраў паказвае, што перанясеньне цэнтру цяжару ў групу, брыгаду павысіла яшчэ больш удзел саюзу ў выкананьні промфінпляну, як па колькасьці, так, і асабліва, па якасьці.

Група, брыгада зьяўляюцца апорнымі пунктамі, дзе ператвараюцца ў жыцьцё важнейшыя дырэктывы партыі і ўраду. Адсюль узмацненьне кіраўніцтва з боку ячэек, колектываў і камітэтаў зьяўляецца рашаючай умовай баявдольнасьці гэтых груп і брыгад.

Практыка перабудовы комсамольскай работы на заводзе Варашылава ўжо ў першыя дні паказала, як значна ўзрос удзел комсамольцаў у выкананьні промфінпляну. Калі завод некалькі месяцаў таму назад меў велізарны прарыў (вытворчая програма выканана на 39 проц.), дык сёньня, у сувязі з перабудовай ўсёй работы партыйных, профсаюзных, комсамольскіх організацый завод набліжаецца да 100 проц. выкананьня промфінпляну.

Перабудова работы на заводзе на аснове шасьці ўказаньняў т. Сталіна паказала, што рад вядучых асноўных брыгад заводу (брыгада гравія-сартовак і інш.) штомесячна перавыконваюць свой промфінплян. Рост асяродку рабочае моладзі на прамысловасьці выклікае патрэбу ў тым, каб комсамольскія організацыі неадкладна ўключылі гэтую масу ў вырашэньне задач соцыялістычнага будаўніцтва.

Марксысцка-ленінскае выхаваньне—магутны вагар выхаваньня гэтых мас у духу бальшавізму. Тав. Посташаў у сваім дакладзе на нарадзе культпропаў пры ЦК УсеКП(б) яскрава падкрэсьліў: „Комсамол—адзін з рэзэрваў партыі. Таму нам надзвычай важна ўзмацніць марксысцка-ленінскае выхаваньне ў комсамоле“.

Узброеньне навічка-комсамольца марксысцка-ленінскімі ведамі—адна з галоўнейшых задач актывізацыі яго, як вернейшага і пярвейшага памочніка партыі.

З мэтай павысіць удзел комсамольскай організацыі БССР на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва, Цэнтральны Камітэт ЛКСМБ выпусьціў сталінскую пуцёўку насустрач чацьвертаму заключнаму.

З часу ўручэньня гэтай пуцёўкі нашаму саюзу прайшло каля месяцу.

Толькі некаторыя комсамольскія колектывы і ячэйкі ў горадзе разгарнулі сапраўдную барацьбу за выкананьне вузлавых маршрутаў пуцёўкі.

Прыкладам рэалізацыі сталінскай пуцёўкі могуць служыць комсамольская цэхавая ячэйка другога хромавага цэху заводу „Бальшавік“, завод „Комунар“, абутковая фабрыка і г. д. Аднак, трэба падкрэсьліць, што сталінскай пуцёўцы яшчэ не нададзен поўны ход. У радзе буйнейшых комсамольскіх колектываў БССР. (фабрыка „Чырвоная Бярэзіна“, завод „ДА“ і інш.) пуцёўка не даведзена да комсамольскіх мас.

Яшчэ горш справа з рэалізацыяй пуцёўкі ў вясковай частцы нашага саюзу. У большасьці раёнаў пуцёўка не даведзена ня толькі да кожнага комсамольца, але нават і да кожнай комсамольскай ячэйкі.

Такое становішча ні ў якім разе ня можа быць цярпіма.

Лістапад месяц павінен зрабіць рашаючы пералом у рэалізацыі сталінскай пуцёўкі як у горадзе, так і на вёсцы.

Комсамольскія організацыі БССР павінны хутчэй перабудоўваць формы і мэтоды сваёй работы адпаведна з новымі задачамі, новымі ўмовамі соцыялістычнага будаўніцтва.

За гэтыя два месяцы, што засталіся да канца трэцяга, рашаючага году пяцігодкі, калі мы завяршаем пабудову фундаманту соцыялістычнай эканомікі, комсамольская організацыя павінна забясьпечыць 100 проц. выкананьне ўсіх паказчыкаў нашай народнай гаспадаркі і ўступіць без аднаго процанту заплазычанасьці ў чацьверты год пяцігодкі.

Інформацыйнае паведамленьне

З 28 па 31 кастрычніка 1931 году адбыўся пленум ЦК УсеКП(б). Плenум разглядзеў наступныя пытаньні:

1. Справаздачны даклад НКШЗ аб выкананьні пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб чыгуначным транспорце.

2. Справаздачны даклад Наркомснабу і Цэнтрасаюзу аб выкананьні пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб разгортваньні савецкага гандлю і палепшаньні забясьпечаньня рабочых, з судакладам ЦКК-РСІ.

3. Практычныя пытаньні бягучай работы.

Адпаведныя рэзолюцыі плenуму прыводзяцца ніжэй.

ДАГАВОР ДРУЖБЫ ПРАЦЯГНУТ

Працягнуты тэрмін дзеяньня дагавору аб дружбе СССР і Турцыі

АНКАРА. Сёньня прадстаўнікамі турэцкай рэспублікі і ССР падпісаны наступны пратакол: „Урад турэцкай рэспублікі і ўрад СССР, лічачы—адказваючым іх узаемным інтарэсам і натхняючым іх жаданьні патрыманьня і яшчэ большае замацаваньне іх нормальных і праслкнутых дружбай адносін, парашылі працягнуць тэрмін дзеяньня дагавору аб дружбе і нэйтралітэце, які быў падпісаны ў Парыжы 17 сьнежня 1925 г., з трыма дадатнымі да яго протаколамі ад таго-ж чысла і тэрмін дзейнічаньня пратаколу 17 сьнежня 29 г. і морскага пратаколу ад 7 сакавіка 31 г., якія падпісаны ў Анкары, і прызначэньні з гэтай мэтай з аднаго боку доктара Тэўфік Рушты-бэя-міністра па замежных справах Турэцкай рэспублікі і Хусэйн Рагіп-бэя—надзвычайнага і паўнамоцнага пасла Турцыі і СССР і з другога боку, п Літвінава—народнага камісара па замежных справах СССР і ц. Сурыца-паўнамоцнага прадстаўніка СССР у Турцыі, якія здалі свае паўнамоцтвы, знойдзеныя ў належным парадку, прынялі наступную пастанову: Арт. 1 Тэрмін дзейнічаньня дагавору аб дружбе і нэйтралітэце. заключанага ў Парыжы 17 сьнежня 25 году з трыма дададзенымі да яго пратаколамі ад таго-ж чысла і тэрмін дзейнічаньня пратаколу аб працягненьні ад 17 сьнежня 29 г. і морскага пратаколу ад 7 красавіка 31 г., якія былі падпісаны ў Анкары, працягнуты на пяцігадовы тэрмін, лічачы з дня вылічэньня тэрміну іх дзеяньня. Аднак, калі ніводзін з адмаўляючыхся бакоў не папярэдзіць другі за 6 месяцаў да канца пяцігадовага тэрміну аб сваім жаданьні спыніць дзеяньне дагавору, а роўна-ж названых вышэй пратаколаў, яны будуць лічыцца аўтоматычна адноўленымі на новы пэрыяд.

Арт. 2. Гэты пратакол уступіць у сілу з моманту яго ратыфікацыі, аб якой кожны з абодвух бакоў паведаміць другі.

Учынена ў Анкары ў 2-х экзэмплярах, 30 кастрычніка 31 году.

Працоўныя Польшчы рыхтуюцца да сьвята Кастрычніка

ВАРШАВА. Ва ўсіх раёнах Польшчы зьявіліся лістоўкі компартыі, лістоўкі заклікаюць да рэволюцыйных выступленьняў пад сьцягам КП Польшчы ў дзень 14 гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі.

У Варшаве, Дамброўскім басэйне Верх. Сілезіі, на Заходняй Украіне адбываюцца мітынгі і масоўкі, на якіх праводзяцца выбары дэлегатаў у СССР.

У Варшаве гэтыя мітынгі мелі месца на заводах і фабрыках у раёнах: Повонзкі, Мураноў і др. Падпісныя лісты па збору сродкаў на праезд дэлегацый маюць вялікі посьпех сярод рабочых і працоўнага сялянства.


(„Правда“).

У РЭВОЛЮЦЫЙНЫМ КІТАІ

ТОКІЁ 1. Тасс. Па зьвесткам Сымбун-Рэнго з Шанхаю, становішча кітайскай чырвонай арміі ў Цзянсі, Хумале і Фудзяве пасьля правалу экспэдыцыі Чан-Кай-Шы значна ўмацавалася. Чырвоныя часьці набліжаюцца да Ханькоў. У сярэдзіне Кастрычніка чырвоныя занялі Цынань (пункт провінцыі Цзянсі). Па зьвестках з Сватоў (провінцыя Гундунь), чырвоная армія 29 кастрычніка заняла Цыняаь (вялікі горад на поўнач ад сватоў).

Выбарныя гушкалкі

„У дзелавых колах ёсьць думка, што консэрватары зараз могуць быць агрэсыўнымі супроць Савецкага Саюзу“
(З газэт)



Батракі Польшчы пад ударамі фашыстых і зямельных магнатаў

Рэвалюцыйная барацьба с.-г. рабочых абвастраецца

У памешчыцкіх гаспадарках Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны занята звыш 800 тыс. сельска-гаспадарчых рабочых, амаль стольскі-ж працуе у якасьці батракоў у кулацкіх гаспадарках. Гэтыя лічбы далёка ня поўныя, яны не ахапілі лясных і сэзонных рабочых, якіх у Польшчы шмат.

Асноўная група сельска-гаспадарчых рабочых—батракі, яны складаюць звыш 30 проц. усіх с-г рабочых.

Вельмі характэрная група сярод батракоў — падсобныя рабочыя, так званыя „посылкі“ Гэтая група складае каля 25 проц. усіх с-г. рабочых. „Посылкі“—гэта рабочыя падзёньнікі, пераважна моладзь.

Гэтыя падзёньнікі залучаюцца на працу такім чынам: наймаючы батрака памешчык у той-жа час патрабуе ад яго прадставіць падсобную сілу. Батрак вымушан альбо запрэгчы ў непасільную цяжкую работу сваіх малалетніх дзяцей, або наймаць каго-небудзь з боку.

Такім чынам затушоўваецца страшэнная эксплёатацыя памешчыкаў. На першы погляд выходзіць; што падзеньнік працуе не у памешчыка, а ў батрака. Вядомая рэч, што памешчыку такая сыстэма найму спрыяе замазваць сапраўдны малюнак жудаснай эксплёатацыі.

Заработная плата с-г. рабочых зусім мізэрная, выдаецца як грашыма так і натурай. Па усёй Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне прыняты у сярэднім наступныя стаўкі: падзёньнік першай катэгорыі (ва ўзросьце да 16 год) атрымлівае ад 35 грашоў да 1,05 злотых у дзень. Зарплата 2-й катэгорыі усе жанчыны і дзяўчаты ад 16 да 18 год)—ад 60 гр. да 1.60 злотых. 3-я катэгорыя (дарослыя мужчыны звыш 18 год)—ад 75 гр. да 2,40 злотых у дзень.

Натурай зарплата выдаецца: ад 1-га да 2-х кілё жыта і некалькі кілёграм бульбы ў дзень на чалавека, што роўне каля 40 гр. ў дзень.

Панщчына ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне зьяўляецца цяпер сыстэмай адпрацоўкі ў памешчыка. За кавалачак арэнднай зямлі сяляне вымушаны адрабляць пэўны лік дзён на памешчыцкай зямлі.

Сыстэма „посылкі“—гэта прымусовая праца дзяцей і жонак сельгасрабочых.

Сюды трэба дадаць яшчэ цэлую сыстэму павіннасьцяй: „аддача памешчыку снапа жыта, стага сена“ і г. д.

Асабліва закаранела гэтая сыстэма ўціску ў некаторых раёнах Малапольшчы. Там, напрыклад, да гэтага часу дзейнічае закон 1885 г. аб поўным праве памешчыка над батраком.

Па гэтаму закону ў Мехаўскім ваяводзтве батраку забараняецца чытаньне якіх-бы там ні было кніжак і газэт.

Памешчыкі, пры непасрэдным падтрыманьні фашысцкага ўраду, асабліва ў апошні час павялі ўзмоцнены наступ на жыцьцёвы ўзровень батрака і бяднейшага селяніна.

Ва ўмовах аграрнага крызісу, які ўсё болей абвастраецца, памешчыкі з дапамогаю ўраду перакладаюць цяжар гэтага крызісу на плечы батракоў і вясковай беднаты.

Ужо самае зьніжэньне цэн на с.-г. продукты зьнізіла кошт натурнай аплаты прыблізна на 50 проц. Але-ж плата натурай, у прыватнасьці бульбай, складае звыш 50 проц. усяго заробку рабочага.

Побач са зьніжэньнем зарплаты, памешчыкі непасрэдна пагаршаюць умовы быту рабочых.

У выніку дэкрэту Пілсудзкага аб урэзцы мізэрнай дзяржаўнай соцыяльнай дапамогі па хваробе, шматлікія масы с.-г. рабочых Пазнані, Верхняй Сілезіі, Малапольшчы, дзе існуюць больнічныя касы, пазбаўлены ўсялякай дапамогі.

У бягучым годзе памешчыкі зьнізілі на 30-50 проц. расцэнкі на зьдзельныя работы, зарплата жанчынам зьніжана з 35 гр. да 25 гр. у дзень.

У гэтым годзе памешчыкі Кракаўскага ваяводзтва ўзялі сыстэму ўзыманьня грашовых штрафаў.

На шалёны памешчыка-фашысцкі наступ с-г. рабочыя адказваюць моцнай хваляю рэволюцыйных стачачных баёў за 8-мі гадзінны рабочы дзень, супроць зьніжэньня зарплаты, супроць зьніжэньня дапамогі па беспрацоўю і г. д.

Стачкомы організуюць с. г. рабочых і бедных сялян у рэволюцыйныя атрады самаабароны.

Растуць пашыраюцца стачкі рабочых.

Пад кіраўніцтвам компартыі пашыраецца рэволюцыйны рух с. г. рабочых супроць нячуванай эксплёатацыі памешчыкаў, паўстаньня супроць політычнага ладу фашысцкай дыктатуры.

Л.

Гэроі фінансавага фронту прэміяваны

Пастанова Народнага комісарыяту фінансаў СССР

Народны Комісарыят фінансаў СССР пастанаўляе:

Прэміяваць колектыў рабочых заводу імя Ланцуцкага у суме 2000 р. перадаўшы гэтыя грошы у распараджэньне заўкому на культурна-бытавыя патрэбы рабочых.

Прэміяваць наступных рабочых, ударнікаў фінансавага фронту:

Тав, Героіма—рабочага фрэзэроўшчыка, старшыню цэхкому — велясыпэдам.

Тав. Старноўскага—рабочага токара, сэкратара ячэйкі КП(б)Б мэханічнага цэху—гадзіньнікам,

Тав. Лярыёнава—рабочага кацельшчыка, аднаго з лепшых брыгадзіраў па рэалізацыі пазыкі—швэйнай машынай.

Тав. Сінюкевіча—рабочага-кацельшчыка старшыню заўкому, вылучэнца актыўнага організатара конфэрэнцыі па ліквідацыі прарываў — фото-апаратам.

Нам. Наркомфіна СССР—Гінкін.

Нач. Галоўнага Кіраўніцтва ашчадкас і дзяржкрэдыту Ліўшыц.

Чарговыя задачы організацыі КП(б)Б

У сувязі з перавыбарамі парторганаў

Усім гаркомам, райкомам, сельпарткомам і ячэйкам КП(б)Б*)

15 лістапада пачынаюцца перавыбары партыйных органаў КП(б)Б.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія гэтага году мае асабліва вялікае значэньне. Яна праходзіць у гістарычным пэрыёдзе завяршэньня трэцяга рашаючага году пяцігодкі і падрыхтоўкі да апошняга, чацьвертага году пяцігодкі.

Наперакор капіталістычным прароцтвам правых опортуністых і іх „левых" саюзьнікаў, КП(б)Б, няўхільна ажыцьцяўляючы правільную ленінскую палітыку, дасягнула найвялікшых перамог на ўсіх фронтах соцыялістычнай будоўлі.

Наша краіна ўступіла ў пэрыод соцыялізму. Пад бальшавіцкім кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б) пераможна завяршаецца пабудова фундаманту соцыялістычнай экономікі. У суадносінах клясавых сіл здабыліся гістарычныя зрухі. Цэнтральнай фігурай земляробства стаў колгасьнік. Соцыялістычны сэктар—саўгасы і колгасы—заваяваў абсолютную перамогу ў экономіцы сельскай гаспадаркі.

У той-жа час ва ўсім капіталістычным сьвеце эканомічны крызіс набыў нябывалыя катастрофічныя формы, перарастаючы ў многіх краінах у крызіс палітычны.

У СССР ліквідавана беспрацоўе, растуць буйнейшыя гіганты індустрыі.

У капіталістычным сьвеце дзесяткі мільёнаў выкінуты на вуліцу, засуджаны на голад і холад. Закрываюцца буйнейшыя фабрыкі і заводы, скарачаецца прамысловасьць. Імпэрыялісты ўсяго сьвету шукаюць выйсьця з крызісу ў яшчэ большым націску на рабочую клясу, у перакладаньні ўсяго цяжару на плечы рабочай клясы, у яшчэ большым прыгнечаньні калёній. Разам з тым імпэрыялісты ўсяго сьвету ліхаманкава рыхтуюцца да нападу на СССР.

Бальшавіцкая Савецкая Беларусь—форпост СССР—больш, як калі-б там ні было, абавязана ўзмацніць абароназдольнасьць нашай краіны.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна ўзмацніць увагу, сувязь і клопаты ўсіх працоўных аб Чырвонай арміі, да работы па ваенізацыі працоўнага насельніцтва, да ажыцьцяўленьня работы асоавіяхімаўскіх організацый.

Ажыцьцявіць шэсьць сталінскіх умоў, поўнасьцю выканаць вытворчую праграму. Па-баявому падрыхтавацца да чацьвертага году пяцігодкі

Справаздачна-перавыбарчая кампанія зьяўляецца баявой падрыхтоўкай да чацьвертага, завяршальнага году пяцігодкі і выкананьня і перавыкананьня плянаў апошняга кварталу рашаючага году пяцігодкі.

Трэба рашуча правільна расставіць сілы на ўсіх процесах вытворчасьці, канчаткова выкарчаваць абязьлічку і устанавіць адказнасьць за работу кожнага варштата і машыны.

Трэба рашуча форсаваць перабудову тарыфнай сыстэмы, паклаўшы канец дробна-буржуазнай ураўнілаўцы, рашуча праводзячы ў жыцьцё прэміяльна-прогрэсіўную зьдзельшчыну.

Перавыбарчая кампанія павінна прайсьці пад знакам карэннай перабудовы ўсёй партыйнай масавай работы ў адпаведнасьці з новымі задачамі партыі, забясьпечыць перабудову партгруп на вытворчасьці і ўзьняць гэту перабудову на новую, вышэйшую ступень.

Асноўны цяжар партработы—у нізавое зьвяно, у цэх, групу, брыгаду, на паравоз. Правільная расстаноўка партыйных сіл, далейшая організацыя і замацаваньне партгруп забясьпечвае кіраўніцтва кожнага нізавога вытворчага зьвяна партгрупай, парторганізацыяй. Узьняць кіруючую ролю партыйных нізавых звёнаў. Уся партыйна-масавая работа павінна быць дыфэрэнцыявана ў адпаведнасьці з задачамі па-ротны ў розных груп рабочых. На гэтых пытаньнях павінна быць сконцэнтравана ўся ўвага парторганізацыі.

Комуністы абавязаны поўнасьцю апраўдаць сваю авангардную ролю на вытворчасьці. Ні аднаго комуніста, ні аднаго комсамольца па-за ўдарным рухам. Перавыбарчая кампанія павінна быць скарыстана для разгортваньня і падняцьця на вышэйшую ступень соцспаборніцтва. Асноўнай і ўдарнай зьяўляецца гаспадарча-разрахунковая ўдарная брыгада.

Барацьба за аўладаньне тэхнікай, за шырокую механізацыю вытворчасьці, за новыя крыніцы соцыялістычнага накапленьня—важнейшыя задачы перавыбарчай кампаніі.

*) Друкуецца у скароч. выглядзе

паніі. У дні перавыбараў прамысловыя партыйныя арганізацыі павінны разгарнуць масавую праверку ўкараненьня гаспадарчага разрахунку ва ўсе галіны прамысловасьці. Кожная парторганізацыя абавязана па-бальшавіцку змагацца за выкананьне задач, пастаўленых у адозве ЦК і СНК аб гаспадарчым разрахунку. Заводы і фабрыкі БССР павінны быць пераўтвораны ў кузьні камандных кадраў і кваліфікаванай рабочай сілы.

„Цяперашні рабочы, наш савецкі рабочы, хоча жыць з пакрыцьцём усіх сваіх матэр'яльных і культурных запатрабаваньняў..." (Сталін). Культурна-бытавое абслугоўваньне рабочых мас, барацьбу за чыстае культурнае жыльлё, за чыстую рабочую сталоўку—у цэнтр увагі партарганізацыі.

Перавыбарчая кампанія павінна быць шырока выкарыстана для праверкі выкананьня дырэктыў партыі аб перабудове работы кооперацыі і рэконструкцыі комунальнай гаспадаркі. Задача кожнай партарганізацыі—устанавіць штодзённы кантроль і кіраўніцтва працай кооперацыі і дзяржаўнага гандлю ў выкананьні задач, пастаўленых перад імі партыяй, праверыць работу кожнага кооперацыйнага зьвяна, мобілізаваць усе ўнутраныя рэсурсы, шырэй разгарнуць ініцыятыву рабочых мас, кооперацыйных і партыйных арганізацый на дапамогу рабочай кооперацыі ў справе забясьпечаньня і грамадзкага харчаваньня.

Ліквідаваць адставаньне транспорту, выканаць плян асеньня-зімовых перавозак

Чыгуначны і водны транспорт БССР ўсё яшчэ адстае.

Баявая задача ўсіх партарганізацый, у першую чаргу чыгуначных, - забясьпечыць пасьпяховае выкананьне асеньня-зімовых перавозак. Мобілізаваць усю масу чыгуначнікаў на бальшавіцкае выкананьне заданьняў тав. Андрэева. Рабочыя, інжынеры, тэхнічны пэрсонал павінны быць мобілізаваны на барацьбу за здаровы гаспадарчы разрахунак, сапраўды ажыцьцяўляючы замацаваньне паравозаў, за здаровы вагонны парк, за ліквідацыю абязьлічкі ў гаспадарцы, за якасьць паравознага рамонту і максімальнае выкарыстаньне паравоза і вагона, за ліквідацыю абязьлічкі і за ўмацаваньне працоўнай дысцыпліны рабочых чыгуначнага і воднага транспорту.

Мобілізаваць масы на далейшае разгортваньне нацыянальна-культурнага будаўніцтва і ажыцьцяўленьне ленінскай нацпалітыкі

На фронце усесаюзнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці ўжо атрыманы буйныя перамогі. Партарганізацыі павінны правесьці перавыбары пад знакам далейшага ўзмацненьня барацьбы за ўсеагульнае навучаньне і політэхнізацыю школ, за перавод БССР у рэспубліку суцэльнай пісьменнасьці, за больш шырокую рэалізацыю пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб школе.

Задача ўсіх партарганізацый і у першую чаргу комуністых ВНУ і ВТНУ—яшчэ больш узьняць тэмпы падрыхтоўкі новых камандных кадраў для соцыялістычнай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, змагацца за стварэньне пролетарскай інтэлігенцыі рабочай клясы, аўладаньне вышэйшымі навукамі.

У галіне палепшаньня работы савецкага апарату, задачай парторганізацый і у першую чаргу комуністых савецкіх усіан ў, зьяўляецца—штодзённая барацьба і выкарчоўваньне бюракратызму у апараце, сапраўднае укараненьне соцсумяшчэньня, дыфэрэнцыяванае і жывое кіраўніцтва раёнамі і павышэньне адказнасьці кожнага працаўніка за даручаную яму работу..

Барацьба за выкананьне фінпляну, мобілізацыя ўнутраных рэсурсаў, правядзеньне ў жыцьцё новай крэдытнай рэформы,—зьяўляецца аднэй з баявых задач усіх парторганізацый.

Праверыць становішча партыйнага кіраўніцтва профсаюзамі і комсамолам, забясьпечыць пасьпяховую перабудову іх работы у адпаведнасьці з указаньнямі тав. Сталіна, вышэй узьняць іх ролю і адказнасьць у барацьбе за праграму трэцяга рашаючага году пяцігодкі і падрыхтоўкі да чацьвёртага году пяцігодкі—адна з важнейшых задач перавыбараў парторганаў.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна замацаваць нашы посьпехі і мобілізаваць масу на далейшае разгортваньне нацкультурнага будаўніцтва і правядзеньне ленінскай нацпалітыкі.

Трэба рашуча узмацніць партыйнае кіраўніцтва на ўсіх вучастках нацыянальна-культурнага будаўніцтва, трэба узьняць барацьбу за беларусізацыю на вышэйшую ступень. Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна узмацніць і палепшыць абслугоўваньне нацменшасьцяй у адпаведнасьці з пастановамі партыі.

Організацыйна-гаспадарчае умацаваньне колгасаў організацыя загатовак—цэнтральная задача вясковых парторганізацый

У новых умовах соцыялістычнага будаўніцтва перад партыйнымі організацыямі сталі новыя задачы. Галоўнае цяпер—у організацыйна-гаспадарчым умацаваньні колгасаў.

Далейшае разгортваньне колектывізацыі, завяршэньне суцэльнай колектывізацыі магчыма толькі на падставе організацыйна-гаспадарчага умацаваньня колгасаў.

Многія парторганізацыі ня улічылі новай абстаноўкі, новых задач колгаснага будаўніцтва. Упартая і настойлівая барацьба за організацыйна-гаспадарчае умацаваньне колгасаў у цэлым радзе раёнаў БССР падменена пагоняй за голай лічбай за дутымі процантамі колектывізацыі.

Трэба сурова і непрымірыма змагацца супроць стаўкі на самацёк у колгасным будаўніцтве і супроць пагоні за дутымі процэнтамі у колектывізацыі.

Вясковыя парторганізацыі павінны правесьці перавыбары пад знакам рашучага узмацненьня сваёй барацьбы за бальшавіцкае правядзеньне загатовак. Зусім нездавальняюча разгортваньне загатовак па БССР ставіць пад ўдар сваячасовае выкананьне гадавога пляну. Карэньні такога становішча хаваюцца у праваопортуністычнай недаацэнцы загатовак з боку цэлага раду раённых парторганізацый і паасобных цэнтральных установаў.

Некаторыя раённыя парторганізацый ня улічылі, што загатоўкі ў гэтым годзе праходзяць у зусім новых умовах, у новай абстаноўцы, якая патрабуе кіраўніцтва загатоўкамі па-новаму.

Выканаць і перавыканаць загатоўчыя пляны — першачарговая задача усіх колгасаў. Барацьба за ажыцьцяўленьне гэтай задачы—асноўны абавязак парторганізацыі.

Ход зябліва па БССР абсалютна нездавальняючы. Плян ворыва стаіць пад ўдарам. Комуністыя саўгасаў, колгасаў і МТС павінны шырэй разгортваць штурм зябліва. Ні адзін гэктар зяблі не павінен застацца неўзараным.

Задача партыйных організацый—не адкладна дабіцца карэннага пералому ў ходзе ворыва, замацаваць на зябліве пастаянныя брыгады, забясьпечыць неадкладную перакідку усіх трактараў і жывой цягі на зябліва.

Кожная парторганізацыя павінна цьвёрда улічыць, што барацьба за зябліва ёсьць барацьба за організацыйна-гаспадарчае умацаваньне колгасаў і ўзьняцьцё ўраджайнасьці. Поўнае выкананьне плянаў зябліва—адна з асноўных задач парторганізацыі.

Разьмеркаваньне даходнасьці ў колгасах павінна быць праведзена толькі на аснове колькасьці і якасьці працы, затрачанай кожным колгасьнікам, толькі па працаднёх.

Вясковыя комуністыя павінны на справе стаць бальшавіцкімі організатарамі колгаснай вытворчасьці. Трэба пакончыць са злачынна маруднымі тэмпамі пераводу колгасаў на зьдзельшчыну. Барацьба за ўкараненьне сапраўднай зьдзельшчыны (а не папяровай, не фармальнай) ва ўсе колгасы, за дакладны ўлік колькасьці і якасьці працы кожнага колгасьніка за аўладаньне агротэхнікай, за якасьць, за ўраджай—важнейшая задача вясковых парторганізацый. Трэба шырэй разгарнуць соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Ня можа быць такога комуністага на вёсцы, які-б не зьяўляўся організатарам мас колгасьнікаў на барацьбу за разгортваньне соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Рашуча ўдарыць па „аліл уйшчыках", якія на словах за генэральную лінію, а на справе праводзяць кулацкую права-опортуністычную практыку.

Перад парторганізацыямі жывёлагадоўчых раёнаў стаяць адказьнейшыя задачы па разгортваньню соцыялістычнай жывёлагадоўлі. Выкананьне дырэктыў ЦК УсеКП(б) аб разгортваньні жывёлагадоўлі зьяўляецца зусім нездавальняючым. Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна даць рашучы перавалом у выкананьні задач, пастаўленых партыяй у справе жывёлагадоўлі, памятаючы, што разгортваньне соцыялістычнай жывёлагадоўлі ёсьць важнейшая політычная задача. Неабходна разгарнуць масавую праверку будаўніцтва сьвінарнікаў і абор, укомплектаваньня сьвінагадоўчых і малочных таварных фэрм. Неабходна мобілізаваць колгасныя масы на аўладаньне зоотэхнікай. Барацьба за стварэньне высокатаварнай фэрмы, за моцную кармовую базу, за сілосаваньне зьяўляецца аднэй з цэнтральных політычных задач.

КП(б)Б дабілася посьпехаў у разьвіцьці тэхнічных культур. Значна вырасла пасеўная плошча пад тэхнічнымі культурамі. Сваячасовая апрацоўка ільну і здача дзяржаве зьяўляецца асноўнай задачай справаздачна-перавыбарчай кампаніі парторганізацый ільнаводчых раёнаў. Парторганізацыі ільнаводчых раёнаў павінны змагацца за далейшае разьвіцьцё і рост пасеўнай плошчы пад ільном.

КП(б)Б мае значныя посьпехі ў саўгасным будаўніцтве. Аднак, цэлы рад раённых і цэнтральных організацый ня выканалі задач, пастаўленых партыяй перад саўгасамі. Асабліва гэта выявілася ў пытаньні загатовак, калі ў Белсаўгастрэсьце і паасобных колгасах праявіліся дробна-буржуазныя, праваопортуністычныя настроі і практыка. Задача раённых парторганізацый і ў першую чаргу парторганізацый саўгасаў—выканаць дырэктывы партыі аб ператварэньні саўгасаў у сапраўдныя ўзоры соцыялістычнай гаспадаркі.

Перад усімі раённымі парторганізацыямі і ў першую чаргу перад комуністымі МТС стаіць задача, каб машына-трактарныя станцыі на справе апраўдалі сваю ролю рухавікоў і організатараў соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі. Кожная МТС павінна неадкладна дабіцца поўнага выкананьня плянаў зябліва, загатовак і сапраўднага ўкараненьня зьдзельшчыны ва ўсіх колгасах.

Перабудаваць партработу на вёсцы, узьняць кіруючую і організатарскую ролю нізавой ячэйкі

Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна яшчэ больш узмацніць і ўзьняць ролю вясковай ячэйкі. Ячэйка павінна стаць сапраўдным кіраўніком і організатарам усяго жыцьця і вытворчасьці саўгасу, колгасу і МТС. Неабходна падняць удзельную вагу сельпарткомаў, як апорных пунктаў партыі на вёсцы. Райкомы павінны аказаць штодзённую конкрэтную дапамогу сельпарткомам у іх рабоце і іх організацыйным замацаваньні.

Вялікія задачы ў сувязі з перавыбарамі стаяць перад друкам. Друк БССР павінен мобілізаваць масу на баявое правядзеньне справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Трэба ўзьняць на яшчэ большую ступень парткіраўніцтва рабселькораўскім рухам, разгарнуўшы ў дні перавыбараў масавую праверку рэалізацыі пастаноў II усебеларускага зьезду рабселькораў.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна яшчэ больш мобілізаваць масу на барацьбу за ленінскую вучобу, за аўладаньне тэорыяй і практыкай марксызму-ленінізму. Бяз узброеньня марксысцка-ленінскай тэорыяй ня можа быць пасьпяховай барацьбы з правым і „левым" опортунізмам у тэорыі і практыцы, ня можа быць барацьбы за бальшавіцкія тэмпы выкананьня гаспадарча-політычных задач.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна даць узмацненьне работы сярод работніц, колгасьніц і аднаасобніц беднячак і серадьнячак. Неабходна рашуча змагацца з праваопортуністычнымі адносінамі да працы сярод жанчын.

Перавыбары павінны прайсьці на аснове найшырэйшага разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі, на аснове далейшага ўзмацненьня ўнутры-партыйнай дэмократыі. Перавыбары павінны даць рост партыі за лік лепшых ударнікаў ад варштата, лепшых ударнікаў саўгасаў, МТС і колгасаў.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б.

Менская комсамолія

прымае актыўны ўдзел у правядзеньні перавыбараў фабзаўмясцкомаў

УВЯЗАЦЬ ПЕРАВЫБАРЧУЮ КАМПАНІЮ З ВЫКАНАНЬНЕМ ГАСПАДАРЧА-ПОЛІТЫЧНЫХ ЗАДАЧ

Палепшыць якасьць падрыхтоўкі

Шырока разгарнулася работа па перавыбарам фабзаўмясцкомаў у комсамольскіх колектывах і ячэйках менскай організацыі. Аднак, побач з радам дадатных якасных паказчыкаў у гэтай рабоце, надзвычай многа і недахопаў. Гэта з усёй яскравасьцю выявіла нарада сакратароў ячэек і колектываў, скліканай Менгаркомам ЛКСМБ рэдакцыяй „Чырвонай Зьмены" і паўпрэдствам „Комсамольскай праўды".

Комсамольскія організацыі заводаў „Комунар, „Варашылава" для лепшай падрыхтоўкі да перавыбараў аб'явілі спаборніцтва паміж сабою. Створаны комсамольскія брыгады па праверцы работы цэхкомаў. Усё гэта шырока асьвятляецца на старонках цэхавых штодзёнак.

Вялікая работа разгорнута і на „Бальшавіку". Комсамольцы абутковай фабрыкі ўсю падрыхтоўчую працу ўвязваюць з гаспадарча-політычнымі задачамі. Фабрыка ўключылася ў конкурс на якасьці продукцыі, комсамольцы ўзялі шэфства над рабочымі прапановамі. Уся работа праводзіцца пад кутом пагляду пераводу ўсіх брыгад на гаспадарчы разрахунак. Комсамольцы шорнай фабрыкі ў час падрыхтоўкі да перавыбараў даводзяць да кожнага комсамольца сталінскую пуцёўку.

Аднак, добрыя прыклады работы на сталі здабыткам усёй комсамольскай організацыі. Гэтыя колектывы ня гледзячы на некаторыя дасягненьні, да гэтага часу не прапрацавалі адозвы ЎсеЦСПС і ЦК УсеЛКСМ аб перавыбарах фабзаўмясцкомаў.

Рад колектываў, як напрыклад, фабрыкі 8-га сакавіка, заводу „Ударнік" і інш. адрываюць падрыхтоўку да перавыбараў фабзаўкомаў ад гаспадарча-політычных задач. Ні адна ячэйка да гэтага часу не заслухалі дакладу прадстаўнікоў комсамолу ў ФЗМК.

Трэба зараз-жа выправіць дапушчаныя памылкі, поўнасьцю распрацаваць адозвы УсеЦСПС і ЦК УсеЛКСМ, увязаць перавыбарчую кампанію з выкананьнем гаспадарча-політычных задач заводаў і фабрык, асабліва з рэалізацыяй сталінскай пуцёўкі, забясьпечыўшы баявы ход перавыбараў.

Казлоў



70 проц. рабочых у праверачных брыгадах

Падрыхтоўка да перавыбараў фабзаўкомаў на гомельскім машынабудаўнічым заводзе „Пролетары" пачалася 20 кастрычніка. Комсамольцы зьявіліся ініцыятарамі організацыі добраахвотных брыгад па праверцы работы заўкому. У выніку брыгадамі ахоплена да 70 проц. усіх рабочых.

Начале кожнай брыгады стаяць комсамольцы, паказваючы сапраўды бальшавіцкія ўзоры працы.

В. Зэльманаў.

